# Тэма 5. ГЕАГРАФІЯ НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ

## § 22. Колькасць і размяшчэнне насельніцтва

***Узгадваем.*** *Якая колькасць насельніцтва свету? У якіх рэгіёнах і краінах высокая шчыльнасць насельніцтва?*

**Дынаміка колькасці насельніцтва.** Колькасць насельніцтва — галоўны паказчык, з якога пачынаецца характарыстыка насельніцтва краіны. Асноўнай крыніцай даных пра яго колькасць з'яўляецца перапіс насельніцтва. Паводле апошняга перапісу, які праводзіўся ў 2009 г., у Беларусі пражывала 9480,2 тыс. чалавек (мал. 93). Першы перапіс насельніцтва Расійскай імперыі 1897 г. налічваў 6673,0 тыс. жыхароў, якія пражывалі ў той час на тэрыторыі Беларусі ў сучасных межах. На працягу многіх гадоў колькасць насельніцтва краіны павялічвалася. У БССР напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны яна дасягнула 9,1 млн чалавек, пасля яе заканчэння — 6,2 млн чалавек. Беларусь страціла кожнага трэцяга свайго жыхара. Толькі да 1972 г. колькасць жыхароў у Беларусі дасягнула даваеннага ўзроўню. Самая ж высокая колькасць насельніцтва была адзначана ў 1994 г. — 10,2 млн чалавек. Сацыяльна-эканамічны крызіс у 1990-х гг. прывёў да скарачэння колькасці насельніцтва Беларусі. *Якія сацыяльна-эканамічныя, дэмаграфічныя, палітычныя і экалагічныя ўмовы аказалі ўплыў на скарачэнне колькасці насельніцтва Беларусі ў XXI ст.?* Толькі ў апошнія гады яна стабілізавалася і па даных на 01.01.2018 г. складае 9491,8 тыс. чалавек.




Мал. 93. Дынаміка колькасці насельніцтва (у сучасных межах, тыс. чал.)

**Размяшчэнне насельніцтва.** Пад размяшчэннем насельніцтва разумеецца яго размеркаванне на пэўнай тэрыторыі і фарміраванне сеткі паселішчаў. Да асноўных фактараў размяшчэння насельніцтва можна аднесці прыродны, гістарычны, сацыяльна-эканамічны і экалагічны (мал. 94). Гістарычна адным з галоўных фактараў размяшчэння насельніцтва быў прыродны. Людзі сяліліся на раўнінных тэрыторыях або каля прыродных вадаёмаў. *Якія віды асваення тэрыторыі звязаны з прыродным фактарам?* Важнае значэнне меў гістарычны фактар, які выяўляўся ў асаблівасцях засялення рэгіёнаў. У цяперашні час прыродны і гістарычны фактары аслабелі. Размяшчэнне насельніцтва рэгулююць сацыяльна-эканамічныя ўмовы жыцця: развіццё вытворчасці, сферы паслуг, наяўнасць транспартных шляхоў і інш. У апошнія гады павялічылася значэнне экалагічнага фактару. Пасля аварыі на ЧАЭС многія тэрыторыі сталі непрыдатнымі для пражывання людзей. *Якія геаэкалагічныя праблемы аказалі ўплыў на размяшчэнне насельніцтва?*




Мал. 94. Фактары, якія ўплываюць на размяшчэнне насельніцтва

Асноўным паказчыкам, які характарызуе размяшчэнне насельніцтва па тэрыторыі краіны, з'яўляецца *шчыльнасць насельніцтва*. *Як разлічваецца дадзены паказчык?* Сярэдняя шчыльнасць насельніцтва Беларусі складае 46 чал./км$^2$, але яна мае істотныя рэгіянальныя адрозненні. Максімальная шчыльнасць насельніцтва ў г. Мінску — 5676 чал./км$^2$, далей у Брэсцкай і Гродзенскай абласцях — 42 чал./км$^2$, а найменшая — у Віцебскай — 30 чал./км$^2$.

Больш за 78 % насельніцтва Беларусі пражывае ў гарадах. Колькасць гарадскога насельніцтва ў цяперашні час складае 7,4 млн чалавек, і яна пастаянна павялічваецца. Самыя высокія тэмпы павелічэння колькасці жыхароў адзначаны ў Мінску. Прырост насельніцтва адзначаецца ў абласных цэнтрах і практычна ва ўсіх гарадах абласнога падпарадкавання. Колькасць сельскага насельніцтва значна меншая за гарадское — 2,1 млн чалавек. *Прааналізуйце змяненне колькасці гарадскога і сельскага насельніцтва па даных на малюнку 93. Якія фактары аказалі ўплыў*

*на памяншэнне колькасці сельскага насельніцтва?* Найбольшая шчыльнасць сельскага насельніцтва фіксуецца ў самых асвоеных раёнах Беларускай грады і прылеглых да іх раўнін, а таксама на тэрыторыях, якія знаходзяцца паблізу вялікіх гарадоў.

**Абагульнім і запомнім.** Колькасць насельніцтва Беларусі на 01.01.2018 г. — 9491,8 тыс. чалавек. Сярэдняя шчыльнасць насельніцтва Беларусі складае 46 чал./км$^2$. Колькасць гарадскога насельніцтва ў тры разы большая за сельскае.

1. Што такое размяшчэнне насельніцтва? 2. Якія фактары аказваюць уплыў на размяшчэнне насельніцтва? 3. Якая сярэдняя шчыльнасць насельніцтва Беларусі?

4. Назавіце прычыны памяншэння колькасці насельніцтва Беларусі ў канцы XX — пачатку XXI ст. 5. Для якіх краін Еўропы характэрная такая ж дынаміка змянення колькасці насельніцтва?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Выкарыстоўваючы даныя табліцы 1 і мал. 5, разлічыце шчыльнасць насельніцтва (у тым ліку гарадскога і сельскага) па абласцях і г. Мінску, пабудуйце дыяграмы і прааналізуйце іх.

*Табліца 1* — Колькасць насельніцтва па абласцях і г. Мінску, 2018 г., тыс. чал.

| Вобласці | Усяго | Гарадское насельніцтва | Сельскае насельніцтва |
|---|---|---|---|
| Рэспубліка Беларусь | 9491,8 | 7412,1 | 2079,7 |
| Брэсцкая | 1384,5 | 976,4 | 408,1 |
| Віцебская | 1180,2 | 914,0 | 266,2 |
| Гомельская | 1415,7 | 1094,9 | 320,8 |
| Гродзенская | 1043,7 | 786,9 | 256,8 |
| г. Мінск | 1982,4 | 1982,4 | |
| Мінская | 1426,5 | 805,9 | 620,6 |
| Магілёўская | 1058,8 | 851,6 | 207,2 |